Источник: "Наша слова" - 2014-02-26

# Юбілей класіка беларускай літаратуры

6 лютага 2014 года ў цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі адбылася музычна-паэтычная вечарына "Аркадзь Куляшоў. Ад Бесядзі да акіяна", прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Да вечарыны прымеркавана адкрыццё кніжнай выставы "... І сэрца абпалена смагай радка", якую падрыхтавала бібліятэка. Творчая спадчына паэта вялікая і шматпланавая, яна налічнвае каля 30 кніг паэзіі. На выставе прадстаўлены вершы паэта на рускай, украінскай, польскай, англьскай, літоўскай, балгарскай мовах, нават на таджыцкай, армянскай, мангольскай і іншых.

У межах мерапрыемства адбыліся выступленні Анатоля Вярцінскага (паэта і журналіста), Ніны Камаровай (загадчыка аддзела абслугоўвання чытачоў ЦНБ імя Я. Коласа НАН), літаратурнага крытыка Тарэзы Голуб. Таксама адбыўся паказ урыўка са спектакля "Майго юнацтва крылы" ў выкананні артыстаў ТЮГа.

У межах мерапрыемства адбылася прэзентацыя малюнкаў пачынаючай мастачкі Алесі Іса, праўнучкі А. Куляшова.

Вечарына закончылася выступленнем фальклорнага ансамбля "Ліцвіны" пад кіраўніцтвам унука А. Куляшова Уладзіміра Берберава. Было вельмі цікава!

***Аляксей Шалахоўскі,***
*гісторык, журналіст,*
*краязнавец.*

Аляксей Шалахоўскі. Юбілей класіка беларускай літаратуры